**Резюме**

В исследовании проведён анализ депутатского представительства на сеймах Речи Посполитой от Полоцкого воеводства во время правления королей династии Ваза. Сделан вывод о преимущественном избрании депутатами от Полоцкого воеводства представителей местных знатных родов, что было общепринято в ВКЛ.

Ключевые слова: сейм, депутат, представительство, шляхта, Великое Княжество Литовское, Речь Посполитая.

**Summary**

The article is dedicated to the investigation of deputy representation of Polotsk province at Seims in Grand Duchy of Lithuania in the reign of the Vaza hous. The conclusion about primery election of representatives ot the local noble families and district officials as Polotsk province deputies is made. It was traditional in GDL.

Key words: Seim, deputy, representation, gentry, Grand Duchy of Lithuania, the Polish-Lithuanian Commonwealth

УДК 947.6. “1944–1946”

## ДА ПЫТАННЯ АБ УЗАЕМААДНОСІНАХ ПАМІЖ АНТЫСАВЕЦКІМІ ФАРМІРАВАННЯМІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР У 1944–1946 ГГ.

**Рыбак Н.А.**

УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г.Гродно, Республика Беларусь

Адным з мала даследаванных пытанняў сучаснай айчыннай гісторыяграфіі з’яўляецца праблема існавання ў заходніх абласцях БССР у пасляваенны перыяд антысавецкага падполля (беларускага, украінскага, польскага і літоўскага). Узаемаадносіны паміж гэтымі фарміраваннямі ўвогуле засталіся па-за ўвагай беларускіх даследчыкаў. Між тым трэба адзначыць, што ўсе гэтыя структуры, змагаючыся за свае незалежныя дзяржавы, бачылі ў іх складзе беларускія землі. Літоўскае падполле, якое дзейнічала ў паўночна-заходніх раёнах БССР, імкнулася да аднаўлення Літоўскай рэспублікі ў даваенных межах. Украінскае падполле, прадстаўленае Арганізацяй украінскіх нацыяналістаў (АУН) і яе ўзброеннымі сіламі – Украінскай паўстанніцкай арміяй (УПА), вяло барацьбу за стварэнне Украінскай незалежнай дзяржавы і актыўна дзейнічала на поўдні рэспублікі. Тэрыторыя Беларусі стала таксама арэнай дзеяння польскага падполля



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

і яго ўзброенных сіл – Арміі Краёвай (АК), якія хацелі аднавіць Польшчу ў межах 1939 г., што азначала ўключэнне ў яе склад заходніх абласцей БССР. Беларускае антысавецкае падполле, якое ў асноўным фарміравалася за кошт калабарантаў, ставіла сваёй мэтай барацьбу за незалежную Беларусь. Нягледзячы на розныя праграмныя мэты і арганізацыйныя прынцыпы ўсе згаданыя вышэй арганізацыі і фарміраванні аб'ядноўваў антысаветызм. Формы і метады барацьбы ў іх былі таксама аднолькавыя і заключаліся ў правядзенні антысавецкай агітацыі і прапаганды, ажыццяўленні дыверсійных і тэрарыстычных актаў супраць партыйна-савецкіх супрацоўнікаў і мясцовага актыву, вядзенні разведвальнай дзейнасці.

Антысавецкае падполле ў заходніх абласцях БССР праіснавала даволі доўга – да сярэдзіны 1950-х гадоў. Гэта было выклікана не столькі падтрымкай антысавецкіх фарміраванняў спецслужбамі Захаду, як сцвярджаюць некаторыя беларускія гісторыкі[12], колькі той непапулярнай палітыкай, што праводзіла савецкая ўлада ў пасляваенны час. Сацыяльную базу антысавецкага падполля складала мясцовае насельніцтва, незадаволенае савецкай уладай. У першую чаргу ў людзей выклікала абурэнне калектывізацыя сельскай гаспадаркі, якая пачалася ў заходніх абласцях БССР, а таксама дзяржаўныя пастаўкі, прымусовая праца на дзяржаўных аб'ектах, антыцаркоўная палітыка, мабілізацыя ў Чырвоную Армію і іншыя мерапрыемствы.

Узаемаадносіны паміж польскім, беларускім, літоўскім і ўкраінскім антысавецкім падполлем былі супярэчлівыя і вызначаліся пэўнымі асаблівасцямі. Стаўленне беларускага падполля да польскага ў гады вайны і пасляваенны час было даволі складанае. Напярэдадні вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сярод беларускіх антысавецкіх арганізацый вылучаліся два лагеры. Першы – антыпольскі: "*Беларуская Незалежніцкая Партыя*" (БНП) і другі – "паланафільскі": "Партыя беларускіх нацыяналістаў" (ПБН), якая імкнулася да супрацоўніцтва з палякамі і АК, пры ўмове дапамогі з боку палякаў пасля вайны у стварэнні "Беларускай дзяржавы" у складзе канфедэратыўнай Польшчы [1, с.119; 2, с.177]. Аднак, падтрымкі ў палякаў гэта прапанова не атрымала [2, с.177]. На ўстанаўленне польска-беларускіх кантактаў пайшла і Беларуская цэнтральная рада (БЦР), але і гэта спроба скончылася нічым [1, с.130].

Адносіны паміж польскім і літоўскім падполлем у гады вайны навогул былі варожымі. Віленская акруга АК вяла актыўную барацьбу

---

[12] Валаханович И.В. Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг.– Мн.: БГУ, 2002. – С.4.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

з літоўскімі фарміраваннямі генерала П.Пляхавічуса, створанымі фашысцкімі акупантамі. Адначасова з барацьбой супраць літоўскіх фарміраванняў, АК ажыцяўляла раззбраенне літоўскіх вёсак, зганяла сем'і літоўскіх асаднікаў з зямель, што выклікала з боку літоўскага насельніцтва адмоўнае і, нават, варожае стаўленне да польскага падполля [3, с.95]. Тым не меньш рабіліся спробы палепшыць адносіны. Як вынікае з данясення савецкіх партызан, яшчэ ў студзені 1944 г. камандаванне Віленскай акругі АК прапанавала літоўскаму падполлю адкласці тэрытарыяльныя спрэчкі і дамовіцца аб сумесных дзеяннях [4, ф.3500, воп.2, спр.49, а.164]. Аднак перамовы поспеху не мелі і канфрантацыя працягвалася. У пасляваенны час таксама не ўдалося дамовіцца аб узаемным супрацоўніцтве. Прычынай нязгоды заставалася спрэчка наконт будучых межаў нацыянальных дзяржаў.

Такімі ж варожымі былі адносіны паміж АК і АУН-УПА. У гады Вялікай Айчыннай вайны польскае і ўкраінскае падполле адкрыта канфрантавала. Увесь час узнікалі ўзброенныя сутычкі, практыкаваліся ўзаемныя правакацыі. Больш таго "*бульбаўцы*" тэрарызавалі мірнае польскае насельніцтва на Палессі і Валыні. Аднак, з набліжэннем Чырвонай Арміі да межаў даваеннай Польшчы, у вайне АК і АУН-УПА наступіла некаторае зацішша. Бакі змірыліся з усталяванымі зонамі ўплыву і пачалі шукаць саюзнікаў у барацьбе з новым ворагам – СССР [5, s. 18].

Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі антысавецкае падполле пачало больш актыўна шукаць саюзнікаў і імкнулася да кантактаў. Так, згодна з інфармацыяй НКУС БССР, якая была атрымана на падставе дакументаў, захопленых у сувязных АК, вынікала, што "*эміграцыйны ўрад у Лондане паставіў перад мясцовымі арганізацыямі, якія існуюць на тэрыторыі Заходняй Беларусі, задачу ўвайсці ў кантакт з беларускім, украінскім і літоўскім падполлем і арганізаваць сумесную барацьбу...*" [6, ф.46, воп.1, спр.1, а.21]. Вядома, што быў праведзены шэраг сустрэч паміж прадстаўнікамі беларускіх, украінскіх, польскіх і літоўскіх антысавецкіх арганізацый з мэтай заключэння пагаднення аб сумеснай дзейнасці супраць савецкай улады [7, 16–22 чэрвеня 1995, с.5]. Пры гэтым, як сцвярджае беларускі гісторык і публіцыст Сяргей Ёрш, яны выліліся ў суместныя аперацыі супраць войскаў НКУС [7, 23–29 чэрвеня, с.5; 7–13 ліпеня 1995, с.5].

Супрацоўніцтва праявілася таксама ва ўзаемнай дапамозе ў сітуацыях, калі навісала пагроза арышту з боку НКУС. Так, вядома, што некаторых дзеячаў беларускага падполля хавала ў сябе АК. Згодна з успамінамі брата беларускага нацыянальнага дзеяча Міхася Ганько – Міколы, акаўцы аказвалі дапамогу многім дзеячам беларускага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГПУ

антысавецкага падполля: хавалі іх, забяспечвалі дакументамі, перапраўлялі ў Польшчу. Дзякуючы падтрымцы польскага подполля многія з іх засталіся жыць і да сёння жывуць у Польшчы [8, с.25–26].

Былі выпадкі ўзаемных ваенных аперацый польскага і беларускага падполля. Так, пасля дэсантавання на тэрыторыю Беларусі ў лістападзе 1944 г. дыверсійнай групы маёра Міхаіла Вітушкі яна ў снежні 1944 г. была затрымана акаўцамі. М.Вітушка меў заданне стварыць на тэрыторыі Беларусі "*Беларускую вызваленчую армію*" для барацьбы з савецкай уладай. Далейшы лёс групы высвятліць цяжка, аднак, па адной з версіяў атрад М.Вітушкі змагаўся супраць савецкай улады ужо ў сладзе АК [9, с.217–218].

Нягледзячы на гэтыя прыклады супрацоўніцтва ўсталяваць доўгатрывалыя ўзаемныя саюзніцкія адносіны паміж рознымі антысавецкімі нацыянальнымі арганізацыямі так і не ўдалося. У пасляваенны час адкрытая барацьба замянілася нейтралітэтам, а ў некаторых выпадках – канфрантацыя захоўвалася.

Адносіны паміж польскім і літоўскім падполлем заставаліся варожымі. Вядомы факты, калі літоўскія фарміраванні імкнуліся раззброіць невялікія атрады АК. Так, у сакавіку 1946 г. на тэрыторыі Ліхачоўскага сельскага савета Гродзенскага раёна літоўскі атрад затрымаў, збіў і раззброіў дваіх удзельнікаў АК [10, спр.3456, а.15, 18].

Такім чынам, апынуўшыся пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пад пагрозай раззбраення і поўнай ліквідацыі, антысавецкае падполле вымушана было ісці на зблiжэнне. Але ўзаемныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі і ўчарашнія канфлікты не дазволілі беларускім, украінскім, польскім і літоўскім антысавецкім структурам усталяваць трывалыя саюзніцкія адносіны. У некаторых выпадках варожасць, якая існавала паміж імі ў гады вайны, захоўвалася. Усё гэта аблягчала органам савецкай улады ліквідацыю антысавецкага падполля.

Літаратура:

1. Туронак Ю. Беларускае пытанне ў палітыцы Лонданскага лагеру.// Спадчына.–1997.– № 3.– С.104–133.
2. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй.– Мн.: Беларусь, 1993.– 236 с.
3. Барабаш В.В. Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 г.).– Гродно: ГрГУ, 1998.– 146 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь у Мінску.
5. Motyka G. Między Krynicą a Białą Podlaską. Walki polsko-ukraińskie 1943–1948.// Mówią wieki.– 1999.– Nr 7.– S.14–19.
6. Архіў Упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама.
7. Ёрш С. Пасляваенны супраціў бальшавіцкім акупантам на Беларусі.// Пагоня.– 1995.– 16–22 чэрвеня.– С.5; 23–29 чэрвеня.– С.5; 7–13 ліпеня.– С.5; 21–27 ліпеня.– С.5.
8. Юрэвіч Л. Вырваныя бачыны. Да гісторыі Саюзу Беларускае Моладзі.– Мн.: Энцыклапедыкс, 2001.– 214 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

9. Сямашка Я. Армія Краёва на Беларусі.– Мн.: БВТ “*Хата*”, 1994.– 270 с.
10. Архіў УКДБ па Гродзенскай вобласці.

**Резюме**

В статье рассматривается взаимоотношения между различными антисоветскими формированиями в 1944–1946 гг. Автор приходит к выводу, что несмотря на некоторое сближение, белорусское, польское, литовское и украинское подполье так и не смогло преодолеть свои противоречия, в основе которых лежали территориальные претензии.

**Summary**

In article is examined mutual relation between various anti-Soviet formations in 1944-1946 years. The author comes to a conclusion, that despite of some rapproachement, Belarusian, Polish, Lithuanian and Ukrainian basement and could not overcome the contradictions, in which basis the territorial claims laid.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ